нюю частку сват дзяліў паміж роднымі ў залежнасці ад ступені сваяцтва: першымі К. атрымлівалі бацькі, затым хросныя, цёткі, дзядзькі і інш. Рэшткі раздавалі ўсім астатнім, яны імкнуліся атрымаць хоць невял. кавалачак, каб пакласці яго ў насеннае збожжа, даць скаціне і хоць крышку з'есці самім. Верылі, што гэта паспрыяе ўрадлівасці, пладавітасці, дасць шчасце і дабрабыт. У наш час, асабліва ў горадзе, К. выпякаецца вытворчым спосабам і не выконвае практычную ўтылітарную функцыю. З рытуальных дзеянняў найб. захаваўся падзел К. — тэатралізаванае прадстаўленне з пажаданнямі, віншаваннямі, часта жартоўна-эратычнага характару, спевамі, танцамі. 2) Хлебны выраб, вял. круглы бохан, выпечаны да свята.

*Літ.*: Никольский Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. Минск, 1956; Вяселле: Песні. Мінск, 1981; Гуслева А.Д., Шамсутдзінава Л.Ф. Каравайны абрад // Беларускія народныя абрады. Мінск, 1994.

*А.М.Аляхновіч, А.А.Прышывалка.*

**КАРАВА́ЙНЫЯ ПЕ́СНІ**, унутрыжанравая разнавіднасць вясельных песень, прымеркаваных да каравайнага абраду. Маюць аднолькавае значэнне з абрадавымі дзеяннямі, вызначаюцца магічным зместам, з'яўляюцца сведчаннем выключнай значнасці хлеба ў жыцці селяніна. У К.п. выкарыстоўваюцца шматлікія паэт. сродкі: эпітэт, параўнанне, гіпербала, метафара, псіхалагічны паралелізм. У адпаведнасці з магічнай функцыяй К.п. падзяляюцца на заклінальныя, велічальныя, рытуальныя і жартоўна-дакаральныя. Заклінальныя песні маюць розныя формы праяўлення ў зваротах, малітвах, просьбах, адрасаваных да вышэйшых духаў, святых, каб яны паспрыялі ў справах: « Дай бог нашаму караваю ў дзяжы спор, а ў печы падход». Велічальныя К.п. ўслаўляюць каравай і каравайніц, якія «прыйшлі так, як зоранькі зышлі», у іх «сінія запаясачкі», «чырвоныя закаўрашачкі», яны «каравай учынілі, замясілі, усадзілі, ручанькамі ды беленькімі, пярснямі залаценькімі». У рытуальных К.п. за быт. дзеяннямі ўзгадваецца міфал. прызначэнне каравая спрыяць ураджайнасці поля і дабрабыту маладых:

А вымайце ж мяне з печы,
Нясіце мяне да клеці,
Палажыце мяне на жыце,
Каб нашым маладым на жыцце,
На багацце і на доўгі век.

Жартоўна-дакаральныя К.п. маюць быт. характар, надаюць вясёлы настрой каравайнай урачыстасці, высмейваюць людскія заганы, што перашкаджаюць ў прыгатаванні караваю: «гарбатыя, зубатыя ў печ саджалі» або «ой, насаты каравайніцы, насаты». У К.п. увасобіўся грамадскі і працоўны вопыт народа, яго эстэтычныя і этычныя ідэалы, думкі і імкненні.

*Літ.*: Гілевіч Н.С. Наша родная песня. Мінск, 1968; Вяселле: Песні. Кн. 2. Мінск, 1981; Палескае вяселле. Мінск, 1984.

*А.М.Аляхновіч.*

**КАРАВА́ЦІЧЫ**, вёска ў Рэчыцкім р-не, на р. Катынь (прыток р. Ведрыч). За 30 км на ПдЗ ад г. Рэчыца, 12 км ад чыг. ст. Бабічы на лініі Гомель—Калінкавічы, 66 км ад Гомеля, каля аўтадарогі Калінкавічы—Гомель. Цэнтр Караваціцкага с/с. 333 гаспадаркі, 704 ж. (2012).

Вядомы з 18 ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяв. ВКЛ. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, у Рэчыцкім павеце Мінскай губ. У 1795 — 20 двароў. У 1858 — 51 двор, 496 ж. У 1886 у Маладушскай воласці, 97 двароў, 675 ж. У 1897 — 171 двор, 986 ж., школа, магазін, крама, карчма. З 1919 у Гомельскай губ. РСФСР. З 8.12.1926 у БССР, цэнтр сельсавета Рэчыцкага р-на Рэчыцкай акругі. З 9.6.1927 да 26.7.1930 у Гомельскай акрузе. З 20.2.1938 у Васілевіцкім р-не Палескай вобл. У Вял. Айч. вайну з канца жн. 1941 да сярэдзіны ліст. 1943 К. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. З 8.1.1954 у Гомельскай вобл. З 16.7.1954 у Першамайскім с/с. У 1959 — 2137 ж. З 16.9.1959 у Рэчыцкім р-не. З 29.11.1962 зноў цэнтр сельсавета. У 1997 — 476 гаспадарак, 1020 ж.

У 2012 сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», 3 магазіны. 2 брацкія магілы сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Археал. помнікі: гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур.

**КАРАГО́Д**, каравод, кола, танок, від харэаграфічнай творчасці народа, які захаваў амаль да нашага часу сінкрэтычны характар, спалучаючы танец, ігру і песню. Узнікненне К. адносяць да глыбокай старажытнасці. Існуе меркаванне, што кругавая пабудова К. тлумачыцца ўвасабленнем салярных культаў, лінейная — водгук паляванняў і войнаў, удзел у танцы ўсіх выканаўцаў звязаны з першабытным укладам жыцця, раздзяленне на пары тлумачаць фарміраваннем класавага грамадства, пабудова ўдзельнікаў у калону — вынік узнікнення гарадоў і сац. размежавання. Несумненна, што з цягам часу К. страціў першапачатковы сэнс, у ім пачынала дамінаваць эстэтычная функцыя. К. ахоплівае і перадае ў паліфаніі фарбаў, рытмаў, рухаў, гукаў драматургію жыцця чалавека: нараджэнне, шлюб, пахаванне, дабро і зло, каханне і здраду, камічнае і трагічнае, прыгожае і пачварнае. Адпаведна пераважанню ў К. аднаго з маст. кампанентаў іх падзяляюць на 3 вял. групы: песенныя, ігравыя, танц. Па сваім функцыянальным прызначэнні вылучаюць К. абрадавыя (прымеркаваны да каляндарных і сямейных свят) і пазаабрадавыя. Вясновыя К. звязаны з магіяй руху, што адпавядала надыходу цёплых дзён («Проса», «Завіванне вянкоў», «Валадар»). У харэагр. веснавой лексіцы распаўсюджаны «ко-

ла», «круг», у якіх выканаўцы рухаліся «па сонцы» або папераменна ў розныя бакі, ці ўтваралі 2 супрацьлеглыя і наступалі «сцяна на сцяну». У купальскіх К. унутраныя пачуцці перадаваліся не індывідуальна, а ад імя ўсёй грамады. Але за агульным вобразам кожны мог знайсці сваё, характэрнае, што знаходзіла водгук у яго сэрцы («Пад тынам рутанька, пад тынам зялёненька»). Зімовым К. уласцівы элементы ігры, драматызацыі («Мак», «Яшчур», «Халімон»). У сямейных абрадах К. выконваліся на вяселлях і былі прымеркаваны да асобных рытуалаў. У павольных пазаабрадавых К. выконваліся разнастайныя малюнкі і рухі: «спіраль», «зорачка», «вароты», «матылёк», «капуста» і інш. Суадносіны ігравых, песенных і танц. кампанентаў у каляндарнай сістэме беларусаў неадназначныя, яны вызначаліся характарам рэгіянальных фалькл. традыцый. Так, ва ўсх. раёнах Магілёўшчыны і ўсх. раёнах Гомельшчыны пераважалі песенна-ігравыя матывы («Страла», «Лука», «Крывы танец»), для якіх характэрны рытмы шэсця, мудрагелістыя лініі ў адзінстве з рухам («крывулькамі»). У наш час К. выкарыстоўваюцца ў апрацоўках і стылізацыях.

*Літ.*: Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии. Минск, 1985; Чурко Ю.М. Белорусский хореографический фольклор. Минск, 1990; Козенка М.А. Танцавальны фальклор // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Мінск, 2001. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе; Яго ж. Там жа. Мінск, 2004. Т. 2. Віцебскае Падзвінне.

*А.М.Аляхновіч.*

**КАРАГО́ДНЫЯ ПЕ́СНІ**, разнавіднасць харэаграфічнай творчасці народа, у якой да нашага часу захаваліся рэшткі першабытнага сінкрэтызму: мелодыя, тэкст, драм. дзеянне, пластыка, міміка, танец. У К.п. пераважаюць напевы павольныя і ўмераныя, часта з распяваннем асобных складоў, шырокім дыханнем і ўзнаўленнем простага ўрачыстага кроку. Існуе меркаванне, што ў найб. ранніх К.п. паводле свайго паходжання адбіліся ахоўныя матывы, звязаныя з рытуалам ахвярапрынашэння, барацьбой за тэр., падрыхтоўкай да палявання, высочваннем здабычы і інш. Значна пазней у К.п. знайшлі адлюстраванне формы вытворчай, земляробчай эпохі («Проса», «Лянок», «Мак»). У працоўны змест К.п. украпваліся элементы любоўна-шлюбнай тэматыкі, звязаныя з выбарам партнёра, каханнем маладых, сямейнымі адносінамі. Лірыка-апавядальны кірунак К.п. вызначае іх харэагр. лексіку — шэсці радамі, парамі, шарэнгамі, рухам па сонцы і насустрач сонцу. Найб. распаўсюджанне К.п. атрымалі ў веснавых і летніх святах. Іх спявалі пасля Дабравешчання, да Вялікадня, на Масленіцу. Вясновыя К.п. «водзяць змейкамі» па вуліцы («На вуліцы дзеўкі гулялі», «Пойдзем, дзевачкі, на вулку»), у летніх і часткова восеньскіх «ідуць з поля сваім ходам» (шарэнгай, парамі), на Калядах ўзнаўлялі вечарыны з мэтай далучэння ўсіх удзельнікаў да абрадавай падзеі. У сямейных абрадах К.п. выконваліся на вяселлях і былі прымеркаваны да асобных рытуалаў — выпечкі *караваю*, абходу з ім хаты, танца маладых («Зазулейка», «Качан», «Ручнікі»). У наш час К.п. існуюць у апрацоўках, стылізацыях на сцэне, якія зроблены прафес. і аматарскімі калектывамі.

*Літ.*: Козенка М.А. Танцавальны фальклор // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Т. 1. Мінск, 2001.

*А.М.Аляхновіч.*

**КАРАЛЕ́НКА** Уладзімір Галакціёнавіч (27.7.1853, г. Житомір, Украіна — 25.12.1921), рускі пісьменнік. Ганаровы акадэмік Пецярбургскай АН (1900). Вучыўся ў тэхн. (1871—73) і Горным (1877—78) ін-тах у Пецярбургу, у Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі ў Маскве (1874—76). Аўтар апавяданняў «Дзіўная» (1880), «Сон Макара» (1885), «Лес шуміць» (1886), «Агеньчыкі» (1901), аповесці «Сляпы музыкант» (1886) і інш. Асобныя творы К. тэматычна звязаны з Беларуссю. Пры напісанні твора «Самазванцы духоўнага прызвання» выкарыстаў звесткі, надрукаваныя ў «Могилёвских губернских ведомостях». Прататыпам гал. героя аповесці «Без языка» (2-я рэд. 1902) паслужыў рабочы-беларус Дзявятнікаў, які разам з К. знаходзіўся ў Вышневалоцкай перасыльнай турме. Быў асабіста знаёмы з Я.Купалам, які ў 1911 падараваў яму свой зб. «Жалейка» з аўтографам (зберагаецца ў літ. музеі К. ў Палтаве). Пад уплывам творчасці К. З.Бядуля напісаў «Абразкі», апавяданне «Сон Анупрэя». Творы К. друкаваліся ў бел. газ. «Наша ніва». У 1922 у Бел. першым драм. тэатры інсцэніраваны твор К. «Лес шуміць». На бел. мову асобныя яго творы пераклалі С.Дарожны, М.Краўцоў, А.Кудравец, К.Чорны, Я.Шарахоўскі. К. прысвяціў верш «Памяці Караленкі» Я.Колас.

*Тв.*: Бел. пер. — Апошні прамень: Выбранае. Мінск, 1984.

*Літ.*: Гущина-Закирова Н.Н., Труханенко А.В. Этюды о жизни и творчестве В.Г.Короленко. Львов, 2009.

**КАРАЛЁНАК** Георгій Георгіевіч (н. 11.2.1957, Мінск), беларускі аператар. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1992). З 1978 на Нац. к/студыі «Беларусьфільм», з 1982 у творчым аб'яднанні «Летапіс». Зняў дакум. фільмы «Мінск, мая сталіца» (2002), «Погляд у будучыню» (2004), «Не ад'язджай!», «Шлях даўжынёй у 20 гадоў», «Рыцар шляхетнага вобраза» (усе 2005), «Беларускі Версаль», «Чалавечыя грані духоўнага крышталя», «Беларускі каравай» (усе 2006), «Беларусь будуецца», «Энергетыка Беларусі» (абодва 2007), «Беларускі крыж», «Лаўрэат» (абодва 2008), «Прыгажосць не прадаецца», «Юбілей беларускага кіно», «Глыбокае» (усе 2009), «Донарства», «Масты акадэміка Барысевіча», «Беларусьфільм-2010», «Рэфарматар» (усе 2010), «Неабыякавы», «Якія спяваюць над возерам», «Апошнія здымкі вайны» (усе 2011), «Бой з ценем» (2012) і інш.